Important Bird Area: Turaŭskaje balonnie

© С. Зуёнок

Code: BY046

Central coordinates: 52°04' N 27°44' E

Location: Gomelskaya voblast: Zhytkavichi region

Area: 672 ha

IBA Criteria: A1, A4i, B1i

National conservation status: Цэнтральныя часта - біялагічны заказнік мясцовага значэння «Тураўскі луг». Усходняя і заходняя часткі – ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Сярэдняя Прыпяць»

International conservation status: ТВП міжнароднай значнасці, утворана ў …. Усходняя і заходняя часткі – Рамсарская тэрыторыя

Site description:

Тураўскі луг, які ў веснавы час уяўляе сабой сістэму акружаных павадкавай вадой астравоў, з’яўляецца ўнікальным, як па набору відаў, так і па колькасці, месцам гнездавання і прыпынку падчас сезонных міграцый кулікоў і іншых водна-балотных відаў птушак. ТВП уяўляе сабой участак прырэчышчнага поймавага луга, які размешчаны ў сярэднім цячэнні ракі Прыпяць і практычна цалкам затапляецца вадой у час веснавой паводкі. Дзякуючы спецыфічнаму месцазнаходжанню і гістарычна сфарміраванай сістэмы гаспадарання на гэтым участку поймы

знаходзіцца адно з буйнейшых у Беларусі пасяленняў рэдкіх відаў кулікоў, у тым ліку і глабальна пагражаемага віду – дубальта *Gallinago media*.

Поймавыя лугі цалкам адкрытыя, сустракаюцца толькі асобныя кусты і купіны вярбы. Нізкае травяное покрыва абумоўлена як характарам глебы, так і інтэнсіўным выпасам жывёлы. Павышаныя ўчасткі чаргуюцца з паніжэннямі.

Пойма ў межах угоддзя адносна нізкая, забалочаная. Берагі ракі невысокія (1-3м), прырэчышчная частка ў выглядзе нешырокага павышэння выяўлена толькі месцамі, цэнтральная пойма плоскахвалістая і плоскагрывістая, прыцерасная пойма складаецца з лагчын, якія чаргуюцца з рэдкімі градамі. Агульны рэльеф угоддзя вызначаецца чаргаваннем невысокіх грыў і невялікіх паніжэнняў між імі, у якіх знаходзіцца мноства невялікіх часовых і пастаянных вадаёмаў. Найбольш узвышаная частка затапляецца вадой толькі ў гады экстрэмальна высокіх паводак. Вада ў паніжэннях трымаецца да канца траўня-сярэдзіны чэрвеня, у даждлівыя гады – на працягу ўсяго цёплага часу.

Патэнцыяльная ТВП знаходзіцца ў непасрэднай блізасці ад г. Тураў. Тым не менш, большая частка тэрыторыі у веснавы перыяд цяжкадаступная – на луг можна трапіць толькі на лодцы. Пасля сходу вады антрапагенная нагрузка тут значна павялічваецца. Асноўнай формай гаспадарчага выкарыстоўвання ўгоддзя ў гэты час з’яўляецца выпас жывёлы і дамашніх гусей. Тураўскі луг можа стаць адной з самых перспектыўных тэрыторый для развіцця арніталагічнага турызму. Ужо зараз яе стыхійна наведваюць шматлікія групы беларускіх і замежных турыстаў.

Флора Тураўскага луга складаецца, у асноўным з травяністай расліннасці і толькі невялікі ўчастак тэрыторыі пакрыты зараснікамі вербалозу.

Травастой на ўзвышшах бедны, моцна з’едзены і вытаптаны жывёлай, у паніжэннях – больш густы і высокі. Стан травянога покрыву ў многім залежыць ад вышыні веснавой паводкі – у гады з высокім узроўнем затаплення травастой пасля сходу вады развіты значна лепш, чым у гады з нізкім узроўнем паводкі. Праектыўнае пакрыццё наземнай расліннасці нераўнамернае – ад 10 да 100%, уздоўж рэчышча Прыпяці маюцца пясчаныя косы, практычна пазбаўленыя травастою. Да сярэдзіны лета травяністае покрыва на найбольш сухіх узвышаных месцах амаль цалкам выгарае. У складзе расліннасці найбольш звычайнымі з’яўляюцца наступныя віды: мятліца звычайная *Agrostis vulgaris*, метлюжок аднагадовы *Poa annua*, расходнік едкі *Sedum acre*, дуброўка гусіная *Potentilla anserina*, птарміка храсткаватая *Ptarmica cartilaginea*, лазаніца *Lysimachia nummularia*

, казялец пякучы *Ranunculus flammula*; у паніжэннях – маннік водны *Glyceria aquatica*, асака лісіная *Carex vulpina*.

Habitats:

Пойвавы вільготны разнатраўны луг – 80%, рэчышчы і іх узбярэжжы – 10%, хмызнякі -10%.

Birds:

Тэрыторыя мае важнае значэнне для падтрымкі папуляцый цэлага шэрагу водна-балотных відаў птушак у час міграцый і гнездавання. На веснавым і асеннім пралётах тут спыняецца для адпачынку і кармёжкі глабальна пагражаемы від гусь-піскулька *Anser erythropus*, а таксама занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі шэрая гусь *Anser anser*, качка-шылахвостка *Anas acuta*, белавокі нырок *Aythya nyroca*, залацістая сеўка *Pluvialis apricaria*, вялікі грыцук *Limosa limosa* і іншыя рэдкія віды птушак.

Вялікі інтарэс прадстаўляюць міграцыйныя скапленні баталёна *Philomachus pugnax*, якія дасягаюць у асобныя гады 50 тысяч асобін. Тураўскі луг у час веснавой міграцыі з’яўляецца адным з важнейшых у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе месцаў прыпынку баталёнаў для папаўнення энэргетычных рэсурсаў перад адпраўкай да асноўных месцаў гнездавання.

Ва ўгоддзі на гнездванні прадстаўлены ўвесь комлекс крычак, якія жывуць у Беларусі, у тым ліку і занесеныя ў Чырвоную кнігу малая крычка *Sterna albifrons* і белашчокая рыбачка *Chlidonias hybrida*. У асобныя гады тут гняздуецца малая *Larus minutus* і шызая чайкі *Larus canus*. У ліку іншых відаў-чырвонакніжнікаў на гнездаванні адзначаны качка-шылахвостка *Anas acuta*, вялікі грыцук *Limosa limosa*, крывок *Haematopus ostralegus*. Тут знаходзіцца адно з самых буйных у Беларусі каланіяльных пасяленняў куліка-марадункі *Xenus cinereus* і вялікага зуйка *Charadrius hiaticula*.

Other animal groups:

Тэрыафаўна ўгоддзя прадстаўлена некалькімі відамі мышападобных грызуноў і буразубак, з амфібій сустракаюцца травяная *Rana temporaria* и вастрамордая *Rana terrestris* жабы, комплекс зялёных жабаў *Rana esculenta-complex*, зялёная рапуха *Bufo viridis*, чырванабрухая жарлянка *Bombina bombina* і звычайная

часночніца *Pelobates fuscus*.

Populations of IBA trigger species:

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends	IBA criteria
Bean goose *Anser fabalis*	P	200-1000 individuals	1996-2011	Good	↓	
White-fronted goose *Anser albifrons*	P	1000-3000 individuals	1996-2011	Good	↓	
Lesser white-fronted goose *Anser erythropus*	P	0-10 individuals	1996-2011	Good	↓	
Greylag goose *Anser anser*	P	0-15 individuals	1996-2011	Good	↓	
Wigeon *Anas penelope*	P	1000-3000 individuals	2006-2011	Good	↔	
Gadwall *Anas strepera*	B	0-5 breeding pairs	2006-2011	Good	↔	
Mallard *Anas platyrhynchos*	P	2000-3000 individuals	2006-2011	Good	↓	
Mallard *Anas platyrhynchos*	B	10-15 breeding pairs	2006-2011	Good	↓	
Pintail *Anas acuta*	P	500-1000 individuals	2006-2011	Good	↓	B1i
Pintail *Anas acuta*	B	2-5 breeding pairs	2006-2011	Good	↓	
Garganey *Anas querquedula*	P	500-1000 individuals	2006-2011	Good	↔	
Garganey *Anas querquedula*	B	10-20 breeding pairs	2006-2011	Good	↓	
Shoveler *Anas clypeata*	P	600-1000 individuals	2006-2011	Good	↔	B1i

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends	IBA criteria
Shoveler *Anas clypeata*	B	10-20 breeding pairs	2006-2011	Good	↓	
Pochard *Aythya ferina*	P	2000-3000 individuals	2006-2011	Good	↓	
Pochard *Aythya ferina*	B	0-10 breeding pairs	2006-2011	Good	↓	
Ferruginous duck *Aythya nyroca*	P	0-10 individuals	2006-2011	Poor		
Smew *Mergus albellus*	P	+	2006-2011	Good		
Red-brested goosander *Mergus serrator*	P	0-20 individuals	2006-2011	Good		
Goosander *Mergus merganser*	P	0-50 individuals	2006-2011	Good		
Bittern *Botaurus stellaris*	B	+	2006-2011	Poor		
Little bittern *Ixobrychus minutus*	B	+	2006-2011	Poor		
Night heron *Nycticorax nycticorax*	P	+	2006-2011	Poor		
Great white egret *Casmerodius albus*	P	10-100 individuals	2006-2011	Good	↔	
Spotted crake *Porzana porzana*	B	5-20 males only	2006-2011	Good	↔	
Little crake *Porzana parva*	P	+	2006-2011	Poor		
Corncrake *Crex crex*	B	3-5 males only	2006-2011	Good	↔	

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends	IBA criteria
Oystercatcher *Haematopus ostralegus*	B	+	2006-2011	Poor		
Ringed plover *Charadrius hiaticula*	B	20-30 breeding pairs	1996-2011	Poor	↓	
Golden plover *Pluvialis apricaria*	P	100-500 individuals	2006-2011	Good	↔	
Ruff *Philomachus pugnax*	P	20000-50000 individuals	1996-2011	Good	↑	A4i
Ruff *Philomachus pugnax*	B	0-10 breeding pairs	1996-2011	Good	↓	
Jack snipe *Lymnocryptes minimus*	P	+	2006-2011	Poor		
Great snipe *Gallinago media*	B	40-50 males only	1996-2011	Good	↑	A1
Black-tailed godwit *Limosa limosa*	P	3000-5000 individuals	2006-2011	Good	↔	A4i
Black-tailed godwit *Limosa limosa*	B	10-50 breeding pairs	2006-2011	Good	↔	A1
Whimbrel *Numenius phaeopus*	P	+	2006-2011	Poor		
Curlew *Numenius arquata*	P	+	2006-2011	Poor		
Spotted redshank *Tringa erythropus*	B	100-600 individuals	2006-2011	Good	↔	
Redshank *Tringa totanus*	B	200-300 breeding pairs	2006-2011	Good	↔	
Greenshank *Tringa nebularia*	P	100-200 individuals	2006-2011	Good	↔	

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends	IBA criteria
Marsh sandpiper *Tringa stagnatilis*	B	0-10 breeding pairs	1996-2011	Good		
Wood sandpiper *Tringa glareola*	P	1000-3000 individuals	2006-2011	Good	↔	
Terek sandpiper *Xenus cinereus*	B	10-20 breeding pairs	1996-2011	Good	↓	
Little gull *Hydrocoloeus minutus*	P	+	1996-2011	Good		
Little gull *Hydrocoloeus minutus*	B	+	1996-2011	Poor	↓	
Common gull *Larus canus*	P	0-50 breeding pairs	2006-2011	Good	↔	
Whiskered tern *Chlidonias hybrida*	B	100-500 individuals	2006-2011	Good	↑	
Whiskered tern *Chlidonias hybrida*	B	0-100 breeding pairs	2006-2011	Good	↔	
Black tern *Chlidonias niger*	P	100-1000 individuals	2006-2011	Poor	↔	
Black tern *Chlidonias niger*	B	100-150 breeding pairs	2006-2011	Good	↔	B2
White-winged black tern *Chlidonias leucopterus*	P	2000-10000 individuals	2006-2011	Good	↑	A4i
White-winged black tern *Chlidonias leucopterus*	B	0-300 breeding pairs	2006-2011	Good	↔	

Other biodiversity:

не вызначана

Threats:

Выпас жывёлы, які рэгулюе стан травастою і стварае ўмовы для гнездавання кулікоў і чайкавых, у пэўны перыяд аказваецца згубным для іх яек і птушанят. Вядомыя выпадкі, калі невялікія статкі коней, якія пасліся на астравах, за адну ноч практычна цалкам знішчалі размешчаныя там гнездавыя калоніі кулікоў у некалькі дзесяткаў гнёздаў.

Recommendations for the conservation:

Для захавання гэтага ўнікальнага луга, які падтрымлівае папуляцыі цэлага шэрагу рэдкіх і ахоўваемых відаў водна-балотных птушак, неабходна забараніць асенняе і, асабліва, вясенняе паляванне; забараніць любыя работы, якія могуць выклікаць змяненне ландшафту і гідралагічнага рэжыму тэрыторыі; абмежаваць, а, па магчымасці, цалкам забараніць выпас жывёлы на лузе да 5 чэрвеня. Акрамя гэтага, для арганізацыі аховы і развіцця турызму мэтазгодна стварыць спецыяльны орган кіравання гэтай тэрыторыяй.

References:

Дадзеныя Тураўскай станцыяй кальцавання птушак падрыхтаваныя Карліонавай Н.В., Пінчуком П.У.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Жураўлёў Д.В., Зуёнак С.В., Карліонава Н.В., Клакоцкі В.П., Мангін Э.А., Мароз С.У., Натыканец В.У., Пінчук П.У.)

Authors : Карліонава Н.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*